# Раздел 2.
# Актуальные проблемы современного музееведения

## ДЫНАМІКА РАЗВІЦЦЯ КРАЯЗНАЎЧЫХ МУЗЕЯЎ БЕЛАРУСІ Ў САВЕЦКІ І ПОСТСАВЕЦКІ ПЕРЫЯДЫ

***І. І. Бамбешка,***
*старшы выкладчык кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Краязнаўчыя музеі – музеі, зборы якіх дакументуюць розныя бакі жыцця (прыродныя ўмовы, гістарычнае развіццё, эканоміку, побыт, культуру) канкрэтнага адміністратыўна-тэрытарыяльнага рэгіёну ці населенага пункта (рэспублікі, края, акруга, вобласці, горада, раёна, вёскі), складаюць частку яго прыроднай і культурнай спадчыны [9, с. 298]. Краязнаўчыя музеі – самы масавы сегмент беларускага музейнага грамадства.

Папярэднікамі краязнаўчых музеяў былі мясцовыя музеі ці музеі мясцовага краю. Яны ствараліся губернскімі статыстычнымі камітэтамі, рознага роду навуковымі таварыствамі, органамі гарадскога самакіравання пры актыўным удзеле мясцовай грамадскасці.

Тэрмін «краязнаўчыя музеі» атрымаў распаўсюджванне ў сярэдзіне 1920-х гг., што было звязана з развіццём краязнаўчага руху, які стаў адной з найбольш яркіх з'яў культурнага жыцця міжваенных дзесяцігоддзяў.

У міжваенны перыяд агульную каардынацыю музейнай дзейнасці краязнаўчых арганізацый, а таксама навукова-метадычную падтрымку ім ажыццяўляла Цэнтральнае бюро края-

знаўства (ЦБК). Ужо пастановы І Усебеларускай краязнаўчай канферэнцыі (Мінск, лістапад – снежань 1924 г.) заклікалі краязнаўцаў уключыцца ў справу стварэння музеяў [10, с. 170–171]. Хаця рэальная праца па стварэнні радзімазнаўчых музеяў у некаторых месцах Беларусі пачалася яшчэ да канферэнцыі. І такім прыкладам з'яўляецца Слуцкі радзімазнаўчы музей, які быў адкрыты ў 1923 г. [11, с. 3]. У 1924 г. акруговымі таварыствамі краязнаўства былі заснаваны музеі ў Оршы, Бабруйску і Барысаве [2, с. 84, 86; 12, арк. 6].

Работа па стварэнні акруговых і раённых краязнаўчых музеяў шырока разгарнулася пасля І Усебеларускага краязнаўчага з'езда (люты 1926 г.), рэзалюцыі якога патрабавалі ад кожнай краязнаўчай арганізацыі стварыць музей [8, с. 83]. У чэрвені 1926 г. у будынку Сафійскага сабору была адкрыта экспазіцыя Полацкага краязнаўчага музея, якая стала вынікам працяглай работы, пачатай яшчэ ў 1919 г. [5, с. 55]. 30 ліпеня 1926 г. быў адкрыты музей у Клімавічах (Калінінская акруга) [7, с. 67]. Адным з апошніх акруговых краязнаўчых музеяў быў адкрыты музей у Мазыры (1927 г.), які спыніў сваё існаванне ў 1938 г. [2, с. 159]. Усяго да канца 1920-х гг. на тэрыторыі БССР дзейнічала сем акруговых музеяў. У іх захоўваліся каштоўныя, а часам і сапраўды ўнікальныя прадметы, якія дакументавалі гісторыю, этнаграфічныя і прыродныя асаблівасці рэгіёну, яго сацыяльна-эканамічнае развіццё. Гэтыя музеі былі адкрыты для наведвальнікаў і былі запатрабаваны ў грамадстве.

Акрамя акруговых музеяў на тэрыторыі Беларусі ствараліся і раённыя краязнаўчыя музеі, большасць якіх з'явілася ў 1927–28 гг., што сведчыла аб сапраўдным пашырэнні краязнаўчага руху, яго пранікненні ў глыб рэспублікі. Для гістарычнай і прыродазнаўчай навук Беларусі, якія знаходзіліся на стадыі назапашвання і сістэматызацыі фактаў, падобная з'ява мела выключнае значэнне. Прымаючы да ўвагі слабую даследаванасць рэспублікі і недахоп навуковых кадраў, збор матэрыялаў па гісторыі, прыродзе і эканоміцы Беларусі сябрамі раённых краязнаўчых арганізацый быў неабходнай умовай стварэння паўнавартаснай крыніцазнаўчай базы. Па дадзеных ЦБК на 1 студзеня 1928 г. у БССР дзейнічала 19 раённых краязнаўчых музеяў, у якіх захоўвалася 15319 музейных прадметаў, прычым 17 з іх мелі ўласнае памяшканне [4, с. 60]. Аднак аналіз перыядычнага друку 1920-х гг. і архіўных крыніц дазваляе давесці гэту лічбу



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

да 27. Шэраг музеяў (17) знаходзіліся ў канцы 1920-х гг. яшчэ на стадыі станаўлення.

Па прычыне сваёй ролі ў культурным жыцці краязнаўчыя музеі аднымі з першых адчулі ідэалагічны ўціск з боку дзяржавы, пачынаючы з канца 1920-х гг. Імкненне ўладаў накіраваць краязнаўчы рух у рэчышча вырашэння бягучых гаспадарчых праблем прывяло да катастрафічных вынікаў: большасць краязнаўчых арганізацый разам з іх музеямі (у Слуцку, Оршы, Мазыры і інш.) перасталі існаваць. Іх каштоўныя зборы таксама былі незваротна страчаны.

На тэрыторыі Заходняй Беларусі захаванне і выкарыстанне ў культурна-адукацыйных мэтах гісторыка-культурнай і прыроднай спадчыны адбывалася ў кантэксце развіцця рэгіяналізму. Вельмі значнае месца ў рэгіяналізме займала таксама разуменне неабходнасці ведання гістарычных традыцый, народнай культуры кожнага краю. У 1926 г. у Варшаве была апублікавана праграма рэгіяналізму, у якой значнае месца адводзілася краязнаўчым (рэгіянальным) музеям, якія павінны былі стаць каардынатарам усёй навуковай і культурнай дзейнасці ў правінцыі. Імклівае павелічэнне колькасці правінцыяльных музеяў абумовіла стварэнне пры Польскім краязнаўчым таварыстве (ПКП) у 1927 г. музейнай камісіі [1, с. 163].

Адным з першых падобных музеяў на тэрыторыі Заходняй Беларусі быў заснаваны ў кастрычніку 1924 г. Палескі музей у Пінску. У канцы 1929 г. былі адкрыты павятовыя музеі ў Слоніме і Баранавічах. Актыўную музейную дзейнасць разгарнула адразу ж пасля ўтварэння ў 1929 г. Ваўкавыскае аддзяленне ПКП. Ёсць звесткі аб спробах адкрыць музеі пры гарадскіх аддзяленнях ПКП у Глыбокім, Браславе, Лідзе, Дзісне і Брэсце.

Пад час Вялікай Айчыннай вайны (ВАВ) калекцыі большасці краязнаўчых музеяў былі страчаны, толькі некаторым удалося часткова эвакуіраваць свае фонды.

Яшчэ да заканчэння ВАВ Наркамат асветы БССР распрацаваў план узнаўлення музейнай сеткі рэспублікі, у якім галоўнае месца адводзілася музеям краязнаўчага профілю [3, с. 35]. Адразу пасля вызвалення Беларусі пачаліся работы па аднаўленні абласных краязнаўчых музеяў у Віцебску (1944), Магілёве (1944), Гомелі (1944). У першыя пасляваенныя гады былі адкрыты і ўзнавілі сваю работу краязнаўчыя музеі ў Брэсце, Баб-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

руйску і Пінску, Барысаве і Баранавічах, Полацку і Мазыры. У пачатку 1950-х гг. пачалі работу музеі ў Тураве, Століне, Слоніме, Слуцку, Ашмянах, Рэчыцы. Значнае павелічэнне колькасці краязнаўчых музеяў вымушала кіраўніцтва краіны і рэспублікі замацаваць іх арганізацыйныя і юрыдычныя асновы. Таму ў маі 1954 г. створанае Міністэрства культуры БССР прыняло «Палажэнне аб краязнаўчым музеі», якое замацавала за краязнаўчымі музеямі статус культурна-асветніцкіх устаноў і паставіла перад імі задачу ўсебаковага вывучэння раёну [6, арк. 283]. Значнае ажыўленне ў дзейнасці краязнаўчых музеяў наступіла ў канцы 1950-х – 1960-я гг., што было звязана з агульнымі працэсамі дэмакратызацыі ў краіне, адраджэннем краязнаўчага руху. Так, у другой палове 1950-х гг. адкрываліся краязнаўчыя музеі ў Лідзе, Маладзечна і Крычаве, а ў 1960-я гг. – у Пухавічах, Гудзевічах, Дзятлаве, г. п. Акцябрскі, Клецку і інш.

У 1970-я гг. колькасць краязнаўчых музеяў рэспублікі значна павялічылася за кошт Карэліцкага, Гарадоцкага, Быхаўскага, Капыльскага, Пастаўскага, Свіслацкага, Салігорскага, Ельскага, Лунінецкага краязнаўчых музеяў. У наступнае дзесяцігоддзе краязнаўчыя музеі з’явіліся яшчэ ў 12 населеных пунктах Беларусі.

У пачатку 1990-х гг. у нашай краіне адбыліся значныя перамены (утварэнне незалежнай дзяржавы, дэмакратызацыя), якія закранулі музейную справу і, без сумнення, былі вынікам палітычных трасфармацый таго часу. Адносіны да нацыянальнай культурнай спадчыны і да музея як яго захавальніка былі прыярытэтным ў культурнай палітыцы маладой дзяржавы.

Знаходжанне ў культурнай прасторы незалежнай краіны патрабавала ад музеяў пераасэнсавання ўласнай дзейнасці на філасофскім і функцыянальным узроўнях. З іншага боку, пераглядзець сваю ролю ў грамадстве, выйсці за межы традыцыйных функцый і сістэм, звярнуцца тварам да працэсаў і з’яў, якія адбываюцца ў сучасным свеце, ад музеяў патрабавалі працэсы глабалізацыі. Развіццё краязнаўчых музеяў незалежнай Беларусі адбывалася двума шляхамі:

– стварэнне новых музеяў у тых раёнах, дзе яны адсутнічалі, што абумоўлена сучаснай тэндэнцыяй да эканамічнага і сацыяльна-культурнага самавызначэння асобных рэгіёнаў. У 1990-я гг. былі заснаваны і адкрыты для наведвальнікаў краязнаўчыя музеі ў Лельчыцах, Круглым, Чавусах, Шклове, Калінкавічах,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Івацэвічах, Хоцімску, Сянно, Ганцавічах, в. Валынцы Верхнядвінскага раёна. У XXI ст. гэты працэс працягваецца: з'явіліся краязнаўчыя музеі ў Добрушы, Лагойску, г. п. Акцябрскі і іншых населеных пунктах Беларусі. Тым не менш музеі (у тым ліку і краязнаўчых) многія раённыя цэнтры Беларусі не маюць музеяў, напрыклад Дуброўна і Докшыцы Віцебскай вобл.; Беразіно, Стоўбцы і Смалявічы Мінскай вобл. (праўда, на працягу некалькіх гадоў у Смалявічах дзейнічае працоўная група па стварэнні музея); Ляхавічы і Маларыта Брэсцкай вобл.; Воранава, Шчучын і Зельва Гродзенскай вобл.; Жыткавічы Гомельскай вобл.; Слаўгарад Магілёўскай вобл.;

– актыўнае развіццё моцных музейных структур, пераўтварэнне іх у буйныя рэгіянальныя цэнтры музейнага дакументавання і камунікацыі. У асобных выпадках краязнаўчыя музеі – гэта ўжо не адзін музей, а кангламерат музеяў, якія адлюстроўваюць гістарычнае мінулае і прыродныя асаблівасці краю, дэманструюць разнастайнасць музейных формаў. Так, на працягу 1990–2000-х гг. сфарміравалася новае аблічча Віцебскага абласнога краязнаўчага музея (ВАКМ), у складзе якога былі ўтвораны розныя па профілю музеі. Тое самае можна сказаць і пра Брэсцкі абласны краязнаўчы музей, Мазырскі аб'яднаны краязнаўчы музей і інш.

Такім чынам, краязнаўчыя музеі Беларусі, якія валодаюць шматтысячнымі калекцыямі і будучы захавальнікамі сапраўднай гісторыі свайго краю, прайшлі ў сваім развіцці вялікі, складаны, супярэчлівы шлях. Заснаваныя ў большасці сваёй у 1920-я гг., музеі неаднаразова перажывалі перыяды росквіту і заняпаду. Дзяржаўная палітыка заўсёды ў той ці іншай меры ўплывала на іх. Перамены, якія адбыліся ў 90-я гады XX ст. у грамадска-палітычным жыцці Беларусі, паставілі перад музеямі задачу пераасэнсавання сваёй ролі і месца ў грамадстве, пошуку новых формаў і накірункаў дзейнасці. Захоўваючы традыцыйныя функцыі, краязнаўчыя музеі істотна пашырылі сферу і формы сваёй дзейнасці.

---

*1. Гужалоўскі, А. А.* Гісторыя музейнай справы Беларусі : вучэб.-метад. дапам. / А. А. Гужалоўскі. – Мінск : Беларускі дзярж. універсітэт, 2012. – 302, [1] с.

*2. Гужалоўскі, А. А.* Музеі Беларусі (1918 – 1941) / А. А. Гужалоўскі. – Мінск: НАРБ, 2002. – 176 с.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. *Гужалоўскі, А. А.* Уводзіны / А. А. Гужалоўскі // Музеі Беларусі / рэд. савет: Г. П. Пашкоў, Л. В. Календа, М. Г. Нікіцін. – Мінск : Беларус. энцыкл., 2008. – С. 3–56.

4. *Казак, А.* Справаздача Цэнтральнага бюро краязнаўства / А. Казак // Наш край. – 1928. – № 5. – С. 55–61.

5. *Мялешка, С.* Полацкі акруговы краязнаўчы музей / С. Мялешка // Наш край. – 1929. – № 12. – С. 55–57.

6. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 974. – Воп. 1. – Спр. 46.

7. Праца Калінінскага акруговага таварыства краязнаўства // Наш край. – 1926. – № 10–11. – С. 62–69.

8. Працы першага Усебеларускага краязнаўчага зъезду. 7–11 лютага 1926 г. – Менск, 1926. – 81 с.

9. *Размутова, Т. О.* Краеведческие музеи / Т. О. Размутова, А. И. Фролов // Российская музейная энциклопедия: в 2 т. – Т. 1. – М.: Прогресс, «РИПОЛ КЛАССИК», 2001. – С. 298–301.

10. Рэзалюцыі Ўсебеларускай краязнаўчай канферэнцыі па арганізацыйнаму пытанню і дакладах навуковых установаў // Асьвета. – 1924. – № 3. – С. 169–171.

11. Уд-нік. Камісія Беларусазнаўства ў Слуцку // Савецкая Беларусь. – 1923. – 25 мая. – С. 3.

12. Цэнтральны навуковы архіў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. – Ф. 67. – Воп. 1. – Спр. 15.

## НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ МУЗЕЯЎ: ШЫРЫНЯ ДЫЯПАЗОНУ

***М. А. Бяспалая,***
*доктар гістарычных навук, прафесар,*
*загадчык кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

Існуе даволі папулярнае вызначэнне музея як месца сустрэчы культуры і адукацыі. Аднак, на наш погляд, у музеі назіраецца выразнае ўзаемадзеянне культуры і навукі, культуры і творчасці. У выніку гэтага шматвектарнага супрацоўніцтва кожны музей паўстае як складаны сацыякультурны арганізм, якому ўласцівы самыя разнастайныя функцыі: ад візуальна-рэпрэзэнтатыўнай да культурна-адукацыйнай.

Генезіс і эвалюцыя музея як сацыякультурнага інстытута адбывалася на працягу тысячагоддзяў. Безумоўна, для гэтага па-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ